Рэгулярны догляд за санітарнымі керамічнымі вырабамі прадухіляе накапліванне бруду, вапнавага налёту, іржы. Ачыстку санітарнай керамікі неабходна праводзіць мяккай шчоткай з выкарстаннем сродку для мыцця. Каб даглядаць за вырабамі санітарнай керамікі, неабходна выкарыстоўваць прызначаныя для гэтых мэтаў сродкі для мыцця. Уважліва чытайце інструкцыю па выкарыстанні, якая размешчана на ўпакоўцы сродка для мыцця.

Забараняецца выкарыстоўваць для догляду за вырабам абразіўныя матэрыялы і грубыя сродкі ачысткі, такія як металічная сетка і жорсткія губкі, а таксама не дапускаецца прымяненне канцэнтраваных кіслот і моцных шчолачаў, бо яны могуць пашкодзіць глазуру, якая нанесена на паверхню вырабу.

Для выдалення ўтвораных плямаў іржы, падцёкаў выкарыстоўваюцца чысцячыя сродкі ў выглядзе вадкасцяў, пастаў і парашкоў. Усе гэтыя прэпараты ўтрымліваюць пэўныя кіслоты, якія раствараюць іржу. У выніку ўтвараюцца солі, якія лёгка раствараюцца і змываюцца вадой.
Рэкамендуецца выкарыстоўваць чысцячыя рэчывы з уласцівасцямі дэзінфіцыравання, што дазволіць падтрымліваць гігіенічную чысціню вырабаў санітарнай керамікі.

Калі ўнітаз-кампакт у зімовы час знаходзіцца ў халодным памяшканні, то неабходна зліць ваду з бачка і выдаліць яе з унітаза, што будзе спрыяць захаванню працаздольнасці бачка з арматурай і ўнітаза. Забараняецца эксплуатацыя вырабу пры тэмпературы наваколля ніжэйшай за 1°С.

Пры эксплуатацыі ўнітаза-кампакта забараняецца:

- выкідваць ва ўнітаз смецце і бытавыя адходы;
- высыпаць/выліваць ва ўнітаз цэментныя і клеевыя сумесі/растворы;
- станавіцца нагамі на сядзенне і накрыўку ўнітаза.

Акрамя самога санітарнага керамічнага вырабу неабходна правільна эксплуатаваць і даглядаць за сядзеннем з накрыўкай для ўнітаза. Для прадухілення дэфармацыі, змянення колеру і з’яўлення драпінаў на сядзенні з накрыўкай для ўнітаза не рэкамендуецца ўжываць для яго чысткі грубыя і абразіўныя рэчывы, едкія прэпараты (кіслоты і лакафарбавыя матэрыялы), забараняецца ставіць на сядзенне і накрыўку цяжкія і цвёрдыя прадметы.